Пралетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б) Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 50 (64) | Аўгорак, 23 кастрычніка 1945 г.

**ПЕРАВЫКАНАННЕМ КАСТРЫЧНІЦКАГА ВЫТВОРЧАГА ПЛАНА, ПАСПЯХОВЫМ ПРАВЯДЗЕННЕМ УСІХ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ РАБОТ, ДАТЭРМІНОВЫМ ВЫКАНАННЕМ УСІХ ВІДАЎ ПАСТАВАК ДЗЯРЖАВЕ СУСТРЭНЕМ 28-Ю ГАДАВІНУ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВОЛЮЦЫІ!**

## Работу хат-чытален—на належную вышыню!

Хата-чытальня—цэнтр масава-палітычнай і культурна-прасветнай работы на вёсцы. Яна павінна задаволіць узросшыя культурныя і палітычныя запатрабаванні вясковага насельніцтва. Сяляне хочуць паслухаць цікавую лекцыю, даклад, ведаць рашэнні партыі і ўрада, пачытаць свежую газету, журнал, атрымаць адказ на тое ці іншае ўзнікшае пытанне.

У нашым раёне ёсць хаты-чытальні, якія ўжо занялі падабаючае ім месца, праводзяць сярод насельніцтва вялікую масава-палітычную работу. Да прыкладу можна прывесці Галоўчыцкую хату-чытальню. Яна мае добра афармлены зал. Сюды кожны вечар сабіраецца моладзь, прыходзяць сяляне, каб пачытаць свежыя газеты, журналы, паслухаць патэфон, пагуляць у шашкі, даміно. Загадчык хаты-чытальні тав. Ваўрук работу наладзіў згодна плана. Ён да работы хаты-чытальні прыцягвае актыў сельсовета.

Да ліку перадавых хат-чытален можна аднесці Заніўсўскую, Іллаўскую. Аднак не ўсюды ўдзяляецца адпаведная ўвага рабоце хат-чытален. Возьмем да прыклада Гарадзецкую хату-чытальню. У памяшканні гразна, на сценах няма ні аднаго плаката, лозунга, няма нават скамеяк. Лекцыі і гутаркі не праводзяцца, не працуюць і гурткі мастацкай самадзейнасці. Аналагічнае становішча і ў Хуллінскай, Дзямідавіцкай хатах-чытальнях. Гэтыя хаты-чытальні не падрыхтаваліся да работы ў зімовых умовах, не маюць паліва.

Работу хат-чытален патрэбна ў корні палепшыць. Сельскім советам, комсамольскім арганізацыям патрэбна удзяліць хатам-чытальням максімум увагі. Трэба паклапаціцца, каб пад хату-чытальню было адведзена добрае памяшканне, каб на зімовы перыяд была дастатковая колькасць паліва.

Кожную хату-чытальню патрэбна добра афарміць, забяспечыць яе кнігамі, газетамі, журналамі. Трэба прыцягваць да актыўнай работы хат-чытален усе культурныя сілы вёскі.

Набліжаюцца выбары ў Вярхоўны Совет СССР. Па ўсёй краіне разгарнулася дзейсная падрыхтоўка да гэтай важнейшай палітычнай кампаніі. У гэты перыяд ад хат-чытален патрабуецца ўзорная работа. Ва ўсіх чытальнях павінна быць разнастойная літаратура па выбарах, трэба, каб агітатары маглі атрымаць патрэбную ім літаратуру для правядзення масава-палітычнай работы сярод выбаршчыкаў. У хатах-чытальнях павінны рэгулярна праводзіцца гутаркі па вывучэнню „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР" сярод насельніцтва.

Трэба работу хат-чытален паставіць так, каб яны былі сапраўды цэнтрам масава-палітычнай і культурна-прасветнай работы на вёсцы.

## УТВАРЭННЕ ВЫБАРЧЫХ АКРУГ ПА ВЫБАРАХ У СОВЕТ САЮЗА І СОВЕТ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЕЙ

На падставе артыкулаў 34 і 35 Канстытуцыі СССР і артыкулаў 24, 25, 26 „Палажэння аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР" Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР ад 16 кастрычніка г. г. створана 656 выбарчых акруг па выбарах у Совет Саюза і 631 выбарчая акруга па выбарах у Совет Нацыянальнасцей.

(ТАСС).



Маршал Югаславіі Іосіп Броз Ціто

## Вывучаюць Палажэнне аб выбарах

З вялікай радасцю рабочыя райпромкамбіната сустрэлі „Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР". Яны праяўляюць да яго выключную зацікаўленасць. Пачалося азнаямленне рабочых з выбарчым законам. Ужо праведзена калектыўная чытка Палажэння аб выбарах.

Для больш падрабязнага і дэталёвага азнаямлення з выбарчым законам выдзелена 10 агітатараў. З імі праведзен семінар.

У кожнай майстэрні агітатары праводзяць гутаркі сярод рабочых аб выбарчым законе.

## СЕМІНАР СТАРШЫН І САКРАТАРОЎ СЕЛЬСОВЕТАЎ

22 кастрычніка райком КП(б)Б правёў семінар старшын і сакратароў сельсоветаў па пытанню падрыхтоўкі да выбараў.

На семінары старшыні і сакратары вывучалі „Палажэнне аб выбарах у Вярхоўны Совет СССР".

# Па прыкладу перадавікоў хутчэй завяршым здачу хлеба дзяржаве!

## АКЦЯБРСКІ СЕЛЬСОВЕТ ВЫКАНАЎ ПЛАН ХЛЕБАНАРЫХТОВАК

Адказваючы на зварот калгаснікаў сельгасарцелі „Чырвоны хлебароб“, Гомельскага раёна аб дастойнай сустрэчы 28-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі, сяляне Акцябрскага сельсовета на 22 кастрычніка выканалі гадавы план хлебанарыхтовак дзяржаве на 100,9 процантаў.

### ЗВОДКА

Аб ходзе збожжанарыхтовак дзяржаве і ў фонд Чырвонай Арміі па 22 кастрычніка.

| №№ п/п | Назва сельсоветаў | Процант выканання |
|---|---|---|
| 1 | Акцябрскі | 100,9 |
| 2 | Дзеткавіцкі | 98,2 |
| 3 | Аніскавіцкі | 96,8 |
| 4 | Худлінскі | 95,6 |
| 5 | Дзямідавіцкі | 89,4 |
| 6 | Першамайскі | 85,9 |
| 7 | Антопальскі | 83,6 |
| 8 | Заніўеўскі | 78,8 |
| 9 | Асінавіцкі | 78,6 |
| 10 | Галоўчыцкі | 78,1 |
| 11 | Ілаўскі | 73,0 |
| 12 | Гарадзецкі | 68,2 |
| 13 | Каменскі | 67,2 |
| 14 | Дзераўноўскі | 47,5 |

Па раёну: 82,3

## Добрасумленна выканаў свой абавязак

Жыў я пры панскай Польшчы ў пакутах і горы. Сям'я была вялікая, а зямлі меў мала. Хлеба ніколі не хапала. Прыходзілася ў самую лепшую пару года працаваць у памешчыка, каб зарабіць кусок хлеба.

Совецкая ўлада ў 1939 годзе дала нам, сялянам, зямлю. Мы былі поўнапраўныя гаспадары.

Але нямецка-фашысцкія захопнікі ў 1941 годзе парушылі нашу мірную працу. З лютай непавісцю ў сэрцы я помсціў нямецкім палачам на палях бітваў.

У баях быў кантужан. З госпіталя я вярнуўся ў родную вёску і з новай энергіяй узяўся за мірную працу. Працуючы на сваёй гаспадарцы, мае думкі заўсёды накіраваны на хутчэйшае залячэнне ран, нанесеных краіне вайной. Як толькі пачаліся хлебанарыхтоўкі, першай маёй думкай было хутчэй разлічыцца з дзяржавай па збожжанастаўках. І я не стаў зацягваць са здачай хлеба. Ужо даўно я здаў на пункт Загатзярно 405 кілограм хлеба дзяржаве і 200 кілограм у фонд Чырвонай Арміі.

Наш сялянскі абавязак—хутчэй разлічыцца з дзяржавай па хлебапастаўках у бліжэйшыя дні.

**Каркашук А. М.**

Вёска Кустовічы, Акцябрскі сельсовет.

## ЗА ДОБРУЮ ПРАЦУ—БАГАТАЯ АПЛАТА

Багаты ўраджай сабралі сёлета калгаснікі сельгасарцелі „Трэці Інтэрнацыянал“, Хоцімскага раёна, Магілёўскай вобласці. Датэрмінова разлічыўшыся з дзяржавай, калгаснікі ўзяліся засыпаць насенныя, страхавыя і фуражныя фонды і пачалі выдачу збожжа і іншых прадуктаў авансам на працадні калгаснікам.

Добрасумленная і адданая праца ў калгасе аплачваецца вялікай колькасцю прадуктаў, што атрымліваюць цяпер калгаснікі на працадні. Сям'я Фёдара Шкаленкі атрымлівае 83 пуды збожжа, 65 пудоў збожжа атрымала сям'я Кузьмы Тамашова. Па 40 пудоў збожжа атрымалі Уладзімір Дзядзечкін і Іван Галушка. („Звязда“).

## ПА СОВЕЦКАМУ САЮЗУ

Закончыліся выпускныя іспыты ў 17 аднагадовых сельскагаспадарчых школах Наркамзема Беларусі. У калгасы рэспублікі выезджаюць 1.400 палявадаў, жывёлаводаў і спецыялістаў-гароднікаў. Праводзіцца новы набор слухачоў. У гэтым годзе ў школах будзе займацца на 800 чалавек больш, чым у мінулым.

У Новасібірску пачалося будаўніцтва новай прадзільнай фабрыкі. Яна ўступіць у эксплаатацыю ў першым квартале будучага года.

На Златаўстаўскім металургічным заводзе ўступіла ў строй магутная мартэнаўская печ № 3.

На Кіраўскім заводзе пачалася падрыхтоўка да выпуску трактараў маркі „Х—80“. Гэта—гусенічны трактар тыпа „Сталінец“, магутнасцю ў 80 конскіх сіл. Першы трактар будзе выпушчан да 28-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі.

## НОВЫ КАЛГАС

У вёсцы Озяты, Озяцкага сельсовета, Жабінкаўскага раёна арганізаваўся калгас імені Варашылава. У калгас уступіла 20 сялянскіх гаспадарак. На агульным сходзе членаў сельгасарцелі старшынёю калгаса выбран Ануфрыюк Фама Грыгор'евіч.

## Насустрач вялікаму святу

Калектыў райпромкамбіната, уключыўшыся ў перадкастрычніцкае соцыялістычнае спаборніцтва, абавязаўся добра падрыхтаваць прадпрыемствы да зімы, перавыканаць кастрычніцкі вытворчы план.

Майстэрні заключылі паміж сабою дагаворы соцыялістычнага спаборніцтва па дастойнай сустрэчы вялікага свята.

Першыя дні спаборніцтва вызначаюцца высокай вытворчасцю працы. Стаханавец ганчарнай майстэрні т. Іванавец, які за верасень выканаў план на 200 процантаў, зараз штодзённа выконвае норму на 180—200 процантаў. Па паўтары—дзве нормы выпрацоўкі даюць кавалі Бортнік і Агіекі.

Ва ўсіх майстэрнях праводзіцца бягучы рамонт, завозіцца паліва.

В. а. рэдактара
П. СПІРЫДОНАЎ

ГЛ 14871 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Совецкая вуліца, дом № 2.